*Аляксандр Смолік*

# АБРАДНАСЦЬ АХВЯРАПРЫНАШЭННЯ Ў СЛАВЯН І ЯЕ ЎВАСАБЛЕННЕ Ў ТВОРЧАЙ СПАДЧЫНЕ ІВАНА КАНДРАЦЬЕВА

У дахрысціянскі перыяд славянскія плямёны сфарміравалі разнастайныя рытуалы і абрады, якія тычацца ўсяго жыццёвага цыкла чалавека: радзінна-хрэсбінныя рытуальныя дзеянні, вясельная абраднасць і рытуалы, звязаныя з культам памерлых. У аснову пахавальных рытуальных дзеянняў пакладзены ўяўленні нашых продкаў аб смерці і замагільным жыцці. Культуралагічны дыскурс у творчай спадчыне славутага беларускага празаіка, паэта, драматурга, перакладчыка, гісторыка XIX ст. І. Кандрацьева дазваляе рэканструяваць аперцэпцыю славян аб іншым свеце. Таленавіты суайчыннік нарадзіўся ў 1849г. у в. Каловічы, Вілейскага ўезда. Літаратурная дзейнасць пачынаецца ў 1868 годзе, калі ў Віленскім весніку» быў апублікаваны яго першы верш. У віленскі перыяд ім былі напісаны і апублікаваны вадэвіль «Волостной писарь, или где хвост начало, там голова мочало», «Сцэнка на Віленскай таўкучцы», «Торг у мястэчках Паўночна-Заходняга краю». У маскоўскі перыяд творчасці І. Кандрацьеў напісаў дзесяткі раманаў, аповесцей, драматургічных твораў («Гунны», «Божье знамение», «Бич божий», «Драма на Лубянке», «Церковная крамольница», «Салтычиха» і інш.). Шкада, але да гэтага часу яго творчасць з’яўляецца tabula rasa беларусаў.



**Малюнак 1 – Іван Кандрацьеў**



**Малюнак 2 – Капішча на Беларусі паводле М.Кашкурэвіча**

У гістарычным рамане з трох частак «Бич божий» распавядаецца аб жыцці славянскага племя венеды, якія па меркаванні асобных гісторыкаў у V ст. засялялі Панямонне. Вельмі панарамна пісьменнікам паказаны побыт славян, вяселныя, пахавальныя абрадавыя дзеянні, абрады ахвярапрынашэння з рознай нагоды. Як вядома, ў гэты перыяд венеды былі язычнікамі і іх уяўленні аб смерці значна адрозніваліся ад хрысціянскіх. Славяне-язычнікі біялагічную смерць не ўспрымалі як канчатковае знікненне чалавека. Пагібель імі разглядалася як пераход у іншы свет, у іншае вымярэнне. Нашы прашчуры верылі ў сустрэчу, злучэнне са сваімі продкамі, сваякамі, каханымі. У рамане І. Кандрацьеў перадае пачуцці маладой дзяўчыны, якая дабрахвотна пагадзілася быць ахвярай на пахавальным вогнішчы загінуўшых у бітве воінаў. Ідучы на ахвярнае вогнішча яна распавядае прысутным, што ёй падаецца: «– Вот вижу я моего отца и мать мою. Вот вижу я всех моих предков. Вот вижу я моего господина: он восседает в светлом, цветущем вертограде, зовет меня! Пустите меня к нему! [1, с. 18] ».

Спадзяецца на сустрэчу ў іншым свеце і князь Балемір, які перад паходам на готаў заклікаў сваю нявесту не пакідаць яго, калі ён загіне ў бітве: «Я иду искать свободы для моей родины; если я погибну, невеста моя, погибни и ты на моем трупе: ты мне всюду будешь дорога». Дзяўчына абяцала выканаць волю воіна і, як паказвае пісьменнік, стрымала сваё слова, Яна першая адгукнулася на зварот жраца быць ахвярай на пахаванні князя і яго дружыннікаў. Згодна рытуалу славян, калі ў іх хто-небудзь паміраў, тады ў яго родных, блізкіх, прыслугі пыталіся: хто жадае памерці з панам? Часцей за ўсе памерці пагаджаліся дзяўчаты. Пагадзіўшаяся на смерць дзяўчына да дня пахавнання ў суправаджэнні дзвух сябровак заўсёды

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКМ

частавалася, спявала і радавалася, што ёй наканавана памерці за каханага пана. І. Кандрацьеў выразнымі мастацкімі сродкамі малюе пахавальны абрад старажытных славян. У V ст. часцей за ўсё выкарыстоўваўся звычай трупаспалення. Творца апісвае прыгатаванне рытуальнага вогнішча. У гэтых мэтах будаваўся спецыяльны зруб, дзе целы загінуўшых клалі на кучы сабранага сухога галля. Старэйшая жанчына (Дэваніча) пакрывала загінуўшых палотнамі, якія былі нарыхтавны раней. Асуджаная на смерць дзяўчына ў пакрывале знаходзілася каля зруба. Закончыўшы рытуал у зрубе Дэваніча здымала пакрывала з дзяўчыны. Пад заклінанні жраца тры дужыя мужчыны перад зрубам падымалі на руках асуджаную дзяўчыну. Яны падымалі тры разы. Потым ахвяру вялі да зрубу. Яна здымала ўпрыгожанні і аддавала жанчыне. Адзін з воінаў наліваў кубак мёду і падаваў дзяўчыне, які тая выпівала са словамі: «Развітваюся з усімі мілымі і дарагімі»! Потым ёй падавалі другі кубак. Дзяўчына выпівала і спявала працягла нешта надзвычай сумнае. Падчас спеваў асуджаную Дэваніча вяла ў зруб. Венеды ў гэты час моцна білі ў шчыты. Гэта рабілася для таго, каб не вельмі чуцен быў крык забіваемай дзяўчыны. У рамане апісваецца эпізод забойства асуджанай: «Войдя
в сруб, Деванича быстро схватила девушку за волосы, опрокинула голову ее назад и шарахнула по горлу ножом. Несчастная начала биться и кричать. Старуха нанесла ей другой удар. Кровь девичья хлынула на хворост, на трупы, а сама она упала на близлежащее тело» [1, с. 19].

Аб чалавечых ахвярапрынашэннях упамінае паэт у сваёй драме «Смерть Аттилы»: «Но жизнь за жизнь охотно я отдамъ, / И, корчась в мукахъ, радоваться буду, / Что сгибъ убійца матери моей / И разоритель родины любимой!» [2, с. 364]. У баладзе «Курган» І. Кандрацьеў таксама намаляваў абрад пахавання важака славянскага племя з чалавечымі ахвярапрынаўэннямі: «И жгли костры, и плакали навзрыдъ. / Убили женъ, рабовъ за ними слѣдомъ, / Чтобъ міру былъ невѣдомъ / Курганъ, гдѣ гробъ зарытъ» [2, с. 52].

З тэкста рамана мы даведваемся, што чалавечыя ахвяры былі частай з'явай і не толкі з выпадку пахаваня. Ахвяры, пры тым ужо не добраахвотныя, а прымусовыя адбываліся ў гонар радасных падзей па ініцыятыве жрацоў. І. Кандрацьеў у дэталях перадае рытуал ахвярапрынашэння з нагоды заняцця славянскім князям Балемірам Кіева ў 376 г. Як і пры пахаванні для ахвярнага вогнішча будавалі зруб каля высокай гары, на якой узвышаўся Пярун. Каля зруба з усходняга боку абавязкова клалі квадратны чорны камень – сімвал сакральнасці, ахвяравання. Цэнтральным персанажам абрада з'яўляўся беласнежны конь. Ён лічыўся свяшчэннай жывёлай і ўтрымліваўся жрацамі ў свяшчэнным гаі. Конь сімвалізаваў чысціню і ўладу. Пагэтаму ўтрыманне белага каня складала адзін з важнейшых абавязкаў жрацоў, яго кармілі, даглядалі. Калі ж конь здыхаў, яго хавалі з асаблівым язычніцкім рытуалам у гаі. Жрацы пачыналі пошукі новага каня, што нярэдка прыносіла ім нямала клопату. Пакуль не знаходзіўся новы беласнежны конь – спыняліся ўсе ахвярапрынашэнні. Па яго іржанні, да якога, дарэчы, жрацы ўмела пабуджалі каня, даведваліся, ці будзе ахвяра прыдатна богу. Пісьменнік сведчыць, што ніколі не здаралася, каб ахвяра не была прынята богам, таму што жрацы ўсялякае іржанне лоўка тлумачылі сабе на карысць.

У рамане маецца глава IV «Чалавечыя ахвярапрынашэнні», у якой дэталёва апісваецца дадзеная абраднасць: «Впереди всех один кыянин вел белоснежного коня с длинной заплетеной гривой и хвостом и с раскрашеными копытами… За конем шли два жреца в белых балахонах с дубовыми венками на головах. Балахоны их были подпоясаны широким пурпуровым поясом. Каждый из них держал в руках длинный жертвенный нож. За жрецами шли обреченные на жертву: отрок и отроковица. Несчастные были покрыты с головы до ног холщовым мешком. Вслед за обреченными, окруженный множеством венедов, ехал сам Болемир, виновник настоящего торжества. За Болемиром пешком и на конях тянулась громада венедов-победителей, а за ними – сотни кыян, одетых в самые разнообразные праздничные одежды.

Приблизившись к приготовленному костру, белый конь вдруг заиграл, начал весело подниматься на дыбы и заржал тем веселым, тем гордо-сознательным голосом, которым дикие свободные кони ржут, почуяв близость таких же, как и они, свободных и быстрых, как ветер, обитателей беспредельных зеленеющих степей. Вся толпа народа, двигавшаяся к костру, как один человек, издала крики радости, потому что она слышала явное предзнаменование, что предполагаемая жертва угодна Перуну и будет принята им с любовью. Значение коня кончилось, и его снова повели в священную рощу, до нового требования.

Начиналось значение жрецов. Подойдя к жертвенному камню, оба жреца пали пред ним ниц. Полежав таким образом некоторое время, они встали и начали осенять камень какими-то таинственными знаками ножом и руками. После этого к ним подвели отрока и отроковицу. С них сняли мешки, и несчастные предстали перед народом во всем ужасе ожидающей их участи. Бледные, дрожащие, с дико блуждающими взорами, они, казалось, потеряли всякое сознание и походили на ягнят, в глазах которых режут их кормилицу-мать. Затем в груду хвороста, который был накидан в середину костра, один из жрецов, шепча про себя молитву, кинул искру священного огня. Огонь этот был принесен из священной рощи и получился от трения одного дерева о другое в священной же роще. Костер быстро вспыхнул, а пламя сразу высоко поднялось к небесам. Это было новым знаком того, что жертва угодна Перуну и будет им принята с любовью. Далее следовала главная часть жертвоприношения – зарезывание обреченных» [1, с. 70].

У рамане «Бич божий» паказваюцца выпадкі адмаўлення ад чалавечых ахвярапрынашэнняў, калі ў якасці ахвяраў забіваліся жывёлы. Так, каб богі абаранялі племя венедаў іх князь Будлі вырашыў прынесці багам ахвяру. У якасці ахвяры былі авечкі: «Жрец после этого засучил рукава своей одежды, а перед ними положили связанного ягненка и барана, он должен был их зарезать» [1, с. 45]. У баладзе «Курган»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

распавядаецца аб ахвярапрынашэнні каня: «И пъли всъ о подвигах владыки. / Надъ гробамъ конь ретивый был убитъ, / У гроба сложен тяжкій мечъ и щитъ, / Снедъ – сложена на лыки» [2, с. 53].

Даследаванне творчай спадчыны паказвае, што ў паэтычных, празаічных і драматургічных творах І.К. Кандрацьева маецца грунтоўны этнаграфічны пласт, які ўзнаўляе шэраг абраднасцяў, рытыуальных дзеянняў далёкіх нашых продкаў. Веданне іх узбагаціць сучаснікаў традыцыямі, духоўнымі каштоўнасцямі, сфарміраваўшыміся за тысячагоддзі.

**Спіс літаратуры:**

1. Кондратьев, И.К. Бич божий / И.К. Кондратьев. – М. : Панорама, 1994. – 147 с.
2. Кондратьев, И.К. Под шум дубрав / И.К. Кондратьев. – М. : Издание И.А. Морозова, 1898. – 422 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ